*Главное управление образования Гомельского областного исполнительного комитета*
*Учреждение образования*
*«Речицкий государственный педагогический колледж»*

# Конкурс «Золотое перо Белой Руси – 2022»

## *Номинация: «Золотые буквы нашей истории»*
## *Категория «Учащийся»*

## *Тема: «Развагі маладога беларуса пра набалелае»*

Автор: Тарасенко Валентина Алексеевна
18.07.2003
учащаяся
УО «Речицкий государственный педагогический колледж»
Адрес: г. Речица
ул.Снежкова, 28
+37529 2708999
Руководитель:
Хмельницкая Мария Николаевна

Речица 2022

**Развагі маладога беларуса пра набалелае**

Дум не скуеш ланцугамі

Я.Купала

Беларусь… Беларус… Сучаснае.. Будучае... Мінулае… Наша зямля. І чужая. Наша радзіма… Гонар? Боль?

Тэма з’явілася спантанна. Магчыма, яе падказаў выпадак. Аўтобус. Размова людзей ва ўзросце. Размова пра іх, немаладых. І пра нас, пра тых, хто ідзе за імі? Побач з імі? А можа, наперадзе? Пра зямлю, на якой жывём. І пра чужаземнае. Дзе лепш? Там? Тут? Там ёсць чым ганарыцца? А ў нас? “Не! Не змагу!”. Але тут жа адказ: “ А чаму і не?! Сёння час складаны. Можа, на самой справе паразважаць… ці можна знайсці шчасце-долю на чужым, далёкім полі?!” У іх – дыскусія. Што гісторыю сваю забыліся. Што не зберагаем каштоўнасці. Што бяжым-спяшаемся. А куды? Шукаем, шукаем, знаходзім. І – страчваем. Імкнемся зноў… Гонар? За што? Няўжо няма нам чым ганарыцца нам тут…(?!)

Думкі пабеглі-паплылі. У душы – спрэчка.

У чым жа дасягненні майго народа, мой гонар?

Напэўна, пачну з гісторыі. Яна як карані дрэва. Ці бывае дрэва без каранёў? Не. Бо гэта жыццё (да памяці прыйшло: жыта – жыць – гінуць… Аднаго кораня. Па-караткевічаўскаму: “Каласы пад сярпом тваім”. І маім.. І Вашым!.. Дзеля жыцця будучага. Страта, боль.. Дзеля лепшага). Нам ёсць чым ганарыцца. А для гэтага мы павінны ведаць мінулае – карані. Ад Вас. Там – пачатак. Толькі ў такім выпадку мы не згубімся, не загубім і сябе, і іншага. І пустазелле не будзе буяць на дарозе жыцця. А дзе ж нам не атрымаць веды, калі не на ўроках гісторыі – гісторыі жыцця народа? Французскі філосаф і сацыёлаг Марыс Хальбвакса адзначыў, што “трэба фіксаваць на паперы тое, што яшчэ жыве ва ўспамінах”. Трэба вывучаць гісторыю. Каб ганарыцца. Менавіта бачу ў гэтым сувязь пакаленняў. І прадказанне будучыні. Адкуль яна, наша гісторыя? Ад Кірылы і Мяфодзія? Ад вялікага Вітаўта? Яна ў Статуце Вялікага Княства Літоўскага? Францыск Скарына, Мікола Гусоўскі…. Чаму не ўспомніць і летапісанне? Ды самае простае. Гісторыя і ў назвах вёсак, мястэчак. Спадчына, якую нельга так проста забыць, замяніць больш сучасным словам, і так часта бяссэнсіцай. Часам зусім недарэчнай. Каб быць сучасным!? Памянялі назву. А сутнасць? Назва ж была не выпадковая. У ёй – гісторыя. (Помню, бабуля з вёскі Зашчоб’е… Шчоўб – гэта балота. І людзі пасяліліся за ім. На ўзгорку. А колькі такіх назваў? Заменім новым… Пра што тое, новае, раскажа?).

Вытокі гонару ў вуснай народнай творчасці. Менавіта ў ёй таемнае, неспазнанае, характэрнае толькі беларусу. Успомніла дзяцінства. І казку. Нашу. Народную. **Каз**ка, **каз**аць, пры**каз**ваць.. У ёй барацьба зла і дабра, светлага і цёмнага. І вучыла яна нас верыць у дзень заўтрашні. Ён абавязкова будзе лепшым. І так на душы было святлей, цяплей… Бо мара была. А мы не

знаходзім часу яе прачытаць. Жывём мабільна. Кудысьці спяшаемся, бяжым. І няма часу прыпыніцца. Адказаць на пытанні. Памарыць..

Традыцыі майго народа. Мы набытае тлумачым проста: “Так трэба”. Гонар у душы, калі ўспамінаю святы. На Купалле кветку папараць шукалі. Ведалі, што не знойдуць. Але шукалі. Што чалавек без мары? Без мэты? Ці жыццё гэта? Існаванне.. Ісці проста па дарозе. Проста. Ці **проста**? Дзяды.. Свята-шанаванне тых, хто даў нам жыццё. А заадно – і тлумачэнне нашага характару, паходжання прозвішча. І цікава было слухаць, што і імя бацькі далі менавіта такое, як бабулю звалі ці дзеда. Усё да ладу было ў сям’і. А песня. Народная. Тая, якая ад сэрца. “Нехта ў лесе гукае, ды нехта ў лесе гукае. Да бацька дзетак збірае… “ І павучанне… “Няма тае крамкі, дзе прадаюцца мамкі”. Колькі ж гонару за нашы прыказкі-прымаўкі?! “Ніхто не зробіць горш табе, чым сам сабе…”, “Чым абыякі, то лепш ніякі…”

А ручнік? Вышыты па краях, а пасярэдзіне – чысціня. Як вечнасць. Як жыццё. І не простыя ручнікі ёсць. Тыя, на якіх праводзілі ў апошні шлях. Зараз я не магу яшчэ ўсё зразумець: як так, пры жыцці думаць пра… небыццё? Зараз у сувоі стаяць тыя ручнікі. Маці іх беражэ. І я гляджу на іх неяк па-іншаму. Ці не дасягненні нашай культуры? Ці не гонар? Памяць… умець берагчы. Лічу, што гонар.

Гонар за беларуса. Працавіты. Цягавіты. Вынослівы. Непрыкметны герой. Дзе доказ? І зноў успаміны пра бабулю. Ёй у вайну было 9. Дзіця. Ці не ў гэтым узросце ўсё запамінаецца назаўсёды? І лёс вырашае? А яна запомніла. Таму хлеб ніколі не быў лішнім у хаце. І накрыты на стале заўсёды. І пачастунак для ўсіх знаходзіўся гасцей. І дзверы на свята былі адчыненыя. А як чакала калядоўшчыкаў! Не дай божа не прыйдуць, хату прамінуць! Таму гонар за гасціннасць нашу. За адкрытую душу. Гэта наша нацыянальная рыса. Гонар.

Гонар за наша беларускае слова. Наша слова цёплае. Шчырае. Гаваркое. Каб не толькі яго пачуць, але і ўбачыць (і зноў да памяці: шлюб таго ж кораня, што і любіць, і жар, і гарэць, і Жыжаль, а напарозніца? А немаўлятка? Колькі цеплыні ў ім! Яшчэ не гаворыць, не мовіць дзіцятка, а матка чакае не дачакаецца).

Гонар за беларускую мову. Была моваю дзяржаўных дыпламатычных зносінаў, на ёй пісаліся сеймавыя пастановы… Ды дзе? У самім Вялікім княстве Літоўскім! А словы Кірылы Тураўскага? Заклік да нас ўсіх быць не проста ўдзельнікамі сучасных падзей, не назіральнікамі, а быць неабыякавымі, быць “жывымі”. Да памяці словы У.Някляева “Каб нас не забылі, пакінем нашчадкам імёны”.

Не будзе мовы – не будзе асобы. Чалавек без радзімы, на чужой зямлі – госць. Ён іншы. Перш чым вывучыць чужую мову, трэба ведаць сваю. Не згубімся тады мы ў людскім натоўпе.

Такім чынам, гістарычныя дасягненні беларускага народа непарыўна звязаны з кожным. Трэба пра гэта ведаць. І тады будзе гонар у душы. І тады мы не згубімся ў натоўпе. Каб бачыць у звычайным незвычайнае. Каб на самой справе быць шчаслівым.

А шчаслівым можна стаць толькі на роднай зямлі. “Дзе радзіўся, то там і прыгадзіўся,” – паўтарала бабуля. А мне хочацца працягнуць: чужая зямля як мачыха, а свая, родная, – маці. Яна карані. А мы, яе дзеці, крона. Крона – карані. Карані – крона. Карані даюць жыццё кроне, галінам. А яны пад ветрам спяваюць сваё. І сумнае. І вясёлае. Адзін без аднаго ніяк. Мы славім зямлю, а яна дае нам сілы.

Ганаруся табой, мая Беларусь, мая маленькая зеленакосая Рэчыца. Бо ты нарадзіла знакамітыя імёны: М.Доўнар-Запольскі, Я.Капелян, Я. Шаціхін, У. Верамейчык, І.Навуменка, У. Ліпскі, А.Сыс… Тут нарадзілася я… І будзеш ты у маім сэрцы заўсёды.

Толькі тут бярозы самыя светлыя. Толькі тут так вітае зямля блакітнае веснавое неба блакітнавокай пралескай. Толькі тут адчуваеш значнасць і таемнасць радкоў Я.Купалы:

Не шукай ты шчасця, долі
На чужым, далёкім полі,
Гэт, за шумным лесам-борам,
За шырокім сінім морам
Не шукай ты шчасця, долі!

Ты ўсё знойдзеш гэта блізка,
Там, дзе маці над калыскай
Табе песні напявала,
Як малога калыхала,
Толькі ўмей шукаці блізка!

Ці не так? Ці не гонар гэта наш з Вамі?